«Бурштынавыя яблыкі ў расе»

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1. Віно з яблычнага соку. **5.** Той, хто знаходзіцца ў сваяцтве з кім-небудзь. **8.** Сорт позніх кіслых яблыкаў; сок з іх знішчае мікробы, што выклікаюць дызентэрыю. **10.** «Капаў нам на вочы яблыневы ..., // На нас валіўся, як снег белы». З паэмы Я. Купалы «Яна і я» («Яблыні цвітуць»). **11.** Які дзень на яблычны Спас (19 жніўня), такі і на ... (14 кастрычніка; прыкм.). **12.** Ад яблыні — яблык, ад елкі — ... (прык.). **15.** Спешная работа на марскім судне. **16.** Лёгкі пабочны заробак (разм.). **19.** ...-матар. Вышэйшая навучальная ўстанова, дзе вучыўся. **21.** На другі Спас і ... яблычка з'есць. **23.** «За паскай зім ідуць палоскі вёсен// І восень — спелым яблыкам у ...». З верша Т. Сямёнавай «Восень». **24.** Адна з назваў яблыкаў летняга сорту белы наліў. **26.** Беларускі ... Сорт яблыкаў беларускай селекцыі, якія паспяваюць у першую палавіну кастрычніка. **27.** Пакуль вочы — свет, пакуль ... — хлеб (прык.).

ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1. Нябеснае цела. **2.** Старажытнаегіпецкі бог Сонца. **3.** ... наша, што без масла каша (прык.). **4.** Кола з шырокім вобадам, дэталь перадачы руху. **6.** ... па яблыку, а галава з арэх (прык.). **7.** «Ападаюць яблыкі: // То іх атрасае вецер, то здзьмухвае ..., пралятаючы міма». З верша М. Танка «Ападаюць яблыкі». **9.** «Бурштынавыя яблыкі ў расе, — // Гэта ты, мая ... !» З верша П. Панчанкі «Дарагая мая Беларусь!» **12.** Вузкая драўляная планка, з якіх робяць плот. **13.** Пірог з яблыкамі. **14.** Яблыкі сярод садавіны ўсё роўна, як ... сярод гародніны (прык.). **17.** «Ну, і яблыкі! Жытнёўкі, // І апорты, і ..., // І ранеты-налівайкі». З верша Р. Крушыны «У Слуцку смачныя ігрушы!» **18.** Яблычны Спас — еш зараз і пра ... (прык.). **20.** Не ўсякая ... хлебам стане (прык.). **21.** Тое, што і збан. **22.** Пра смелага, гордага чалавека (перан.). **25.** Мера зямельнай плошчы.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,
г. Дзяржынск.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:

Па гарызанталі: 1. Сідр. 5. Сваяк. 8. Антонаўка. 10. Цвет. 11. Пакроў. 12. Шыпшына. 15. Аўдар. 16. Кальцым. 19. Альма. 21. Жабрак. 23. Акно. 24. Пандрэўка. 26. Сінап. 27. Рукі.

Па вертыкалі: 1. Сваціна. 2. Ра. 3. Гора. 4. Шкіў. 6. Вочы. 7. Кажан. 9. Белараусь. 12. Штыкет. 13. Шарпотка. 14. Бульба. 17. Мадоўкі. 18. Запас. 20. Мука. 21. Жбан. 22. Апор. 25. Ар.

■ Гэта ж мы, Госпадзі...

Прапілі дзіця

З-за непрабуднага п'янства брастаўчане нават не заўважылі, што іх гадавалае дзіцятка захварэла, што яно мае патрэбу ў неадкладнай дапамозе.

Яны выклікалі «хуткую», калі хлопчык ужо «не падаваў прыкмет жыцця», як гаворыцца ў афіцыйных дакументах. Следчыя таксама адзначылі, што слядоў якога-небудзь гвалту на целе дзіцяці не выяўлена. Малое ціха сканала ад пнеўманіі, пакуль яго 47-гадовы бацька і 30-гадовая маці выпівалі за грошы дзіцячай дапамогі, бо іншых крыніц існавання ў іх не было.

У гэтай гора-сям'і было трое дзяцей: старэйшы сын-школьнік і двайняткі 2016 г. н. Сям'ю раней прызнавалі ў сацыяльна небяспечным стане, дзяцей на некаторы час змяшчалі ў прытулак. Але бацькі прыходзілі, абяцалі выправіцца. Хлопчыка і дзяўчынку забралі з сям'і, дзеці знаходзяцца ў бальніцы. Рыхтуюцца дакументы аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў гэтых мужчыны і жанчыны.

Святлана ЯСКЕВІЧ

Эха вайны ў сталіцы

Падчас правядзення зямляных работ на вуліцы Ванеева ў Мінску рабочыя знайшлі 100-кілаграмовую авіяцыйную бомбу часоў Вялікай Айчыннай вайны.

Паведамляецца, што падчас капання траншэі непадалёк ад развязкі вуліц Ванеева і Даўгабродскай рабочыя ўбачылі боепрыпас вагой каля 100 кілаграмаў. Ім аказалася авіябомба ФАБ-100 савецкай вытворчасці. На месца прыбыла сапёрна-піратэхнічная група выбуховатэхнічнага цэнтра ўнутраных войскаў. Спецыялісты выцягнулі знаходку і пагрузілі на спецтранспарт для ўтылізацыі на палігоне пад Барысавам. Акрамя гэтага, сапёры абследавалі прылеглую да месца знаходкі тэрыторыю.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

Даты | Падзеі | Людзі

19 ЖНІЎНЯ

Сусветны дзень фатаграфіі. Адзначаецца з 2010 года. 19 жніўня 1839 года ўрад Францыі, які купіў патэнт французскага хіміка і вынаходніка Луі Жака Мандэ Дагера пра метад атрымання адбітка (дагератыпа), зрабіў адкрыццё дагератыпаў здабыткам сусветнай грамадскасці.

1887 год — мінчане назіралі поўнае сонечнае зацьменне, падчас якога праводзіліся першыя прафесійныя метэаралагічныя назіранні. Іх вынікі перададзены ў Галоўную фізічную абсерваторыю ў Пецярбургу.

1892 год — нарадзіўся (в. Забалацце, цяпер у Рагачоўскім раёне) Барыс Сяргеевіч Гарбачоў, савецкі ваенны дзеяч, герой Грамадзянскай вайны, камкор (1935). Удзельнік барацьбы за Савецкую ўладу ў Ігуменскім павеце, ваенны камісар павета. Камандаваў асобным кавалерыйскім палком, кавалерыйскай брыгадай у 1-й Коннай арміі. З 1926 года — камандзір брыгады, дывізіі, начальнік і ваенкам Аб'яднанай ваеннай школы імя ВЦВК, камандзір і ваенкам навучальных устаноў Маскоўскай ваеннай акругі. У 1937 годзе — камандуючы войскамі Забайкальскай, Уральскай ваенных акруг. Рэпрэсіраваны 3 ліпеня 1937 года, быў асуджаны Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР да смяротнага пакарання і ў той жа дзень расстраляны. 14 сакавіка 1956 года рэабілітаваны.

1912 год — нарадзіўся (г. Бабруйск) Барыс Мікуліч, беларускі пісьменнік, крытык. З 1928 года член бабруйскага філіяла «Маладняка». З 1929-га працаваў у бабруйскай газеце «Камуніст». У 1930-м пераехаў у Мінск. Працаваў карэктарам у Дзяржвыдавецтве БССР; стыльрэдактарам, адказным сакратаром у газеце «Літаратура і мастацтва». Член СП БССР. Да 1936-га выдаў 7 мастацкіх кніг. Тэматыка твораў гэтага перыяду: падзеі Грамадзянскай вайны, паслякастрычніцкая рэчаіснасць, складанасць барацьбы новага і старога ў тагачаснай вёсцы. Арыштаваны 26 лістапада 1936 года, асуджаны пазасудовым органам НКУС як «член контррэвалюцыйнай нацыянал-фашысцкай арганізацыі» і за «антысавецкую дзейнасць» да 10 гадоў ППК. У чэрвені 1947 года без дазволу ўлад вярнуўся ў Беларусь. У лістападзе 1947 года з яго была знята судзімасць. Арыштаваны паўторна 28 красавіка 1949 года, высланы ў Сібір на вечнае пасяленне. Жыў у сяле Машукоўка Краснаярскага краю, дзе і памёр. Рэабілітаваны 29 снежня 1954 года, праз тры месяцы пасля смерці.

1910 год — нарадзіўся (г. Сянно) Алесь Жаўрук (сапр. Сінічкін Аляксандр Дзмітрыевіч), беларускі паэт. У 1938 годзе скончыў Маскоўскі інстытут гісторыі, філасофіі і літаратуры. З 1939 года — ваенны карэспандэнт армейскай газеты «В бой за Родину». Аўтар паэтычных зборнікаў «Ручаіны», «Дняпро выходзіць з берагоў», паэм «Крывёю сэрца», «Пра майго таварыша» і інш. Напісаў лібрэта аперэты «Зарэчны барок». Загінуў у 1942 годзе ў баях пад Сталінградам.

Было сказана

Васіль ЖУКОВІЧ, паэт:

«Куток, дзе ты першае слова сказаў,
Малым называцца не можа».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.55	20.30	14.35
Віцебск —	5.41	20.23	14.42
Магілёў —	5.45	20.20	14.35
Гомель —	5.46	20.13	14.27
Гродна —	6.10	20.45	14.35
Брэст —	6.15	20.41	14.26

Месяц

Маладзік 21 жніўня.
Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *ПРААБРАЖЭННЕ ІСУСА. ЯБЛАЧНЫ СПАС. Андрэя, Мікалая.*
К. *Канстанцыі, Андрэя, Баляслава, Юльяна, Яна.*

Фота Максіма ШАСТАКОВА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Галоўнае ў скачку цераз канаву — злавіць тэлефон, які ляціць побач з кішэняй.

Строга сяджу на дыеце: раніцай — ёгурт, у абед — чай з лімонам, на вячэру — лёгкая салата з агурка, мяса, каўбасы, смятаны, пельменяў, курыцы, рыбы і булачак...

На словы жонкі «Усё, я ад цябе сыходжу!» малады муж пачне прасіць прабачэння, дасведчаны моўчкі перачакае істэрыку, а бывалы сумна скажа: «Ты толькі абяцаеш!»

Муж сказаў мне:
— Худзей, ці я пайду да іншай.
Я пахудзела і сама пайшла да другога.
Мараль: не трэба нас палохаць.

Брытанскія навукоўцы нядаўна адкрылі, што пятніца была прызнана працоўным днём праз памылку. А панядзелак наогул памылкова лічыцца днём тыдня.

Дзяўчаты, памятайце: падчас дыеты сала трэба есці без хлеба!

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3072. Нумар падпісаны ў 19.30 18 жніўня 2017 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12